***Мурашка Н. У.**, магістр, настаўнік пачатковых класаў сярэдняй школы № 196 г. Мінск;*
***Шылава А. С.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту*
*і адукацыйных тэхналогій факультэта кіравання і прафесійнага развіцця педагогаў*
*Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*

# Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі літаратурнага чытання ў II класе

Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на ўроках літаратурнага чытання ў II класе патрабуе ад настаўніка вырашэння такіх задач, як развіццё вобразнага ўяўлення, маўленчай актыўнасці, здольнасці да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры, фарміраванне агульнавучэбных уменняў працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў [1, с. 17].

Для вырашэння гэтых задач мы прапануем настаўнікам выкарыстоўваць тэхналогію навучання ў супрацоўніцтве на ўроках літаратурнага чытання. У папярэдніх артыкулах мы ўжо разглядалі магчымасці яе выкарыстання на ўроках матэматыкі ў III класе [2] і беларускай мовы ў I класе [3]. У гэтым артыкуле мы разгледзім варыянт тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве **«Навучанне ў камандзе»** на прыкладзе яе выкарыстання на ўроках літаратурнага чытання ў II класе.

Паколькі аб самой тэхналогіі мы падрабязна пісалі, узгадаем толькі алгарытм яе выкарыстання.

Этапы (або алгарытм) рэалізацыі варыянта «Навучанне ў камандзе» можна прадставіць наступным чынам:

1) настаўнік тлумачыць вучням новы матэрыял або заданне;

2) настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па чатыры чалавекі;

3) кожная група атрымлівае аднолькавыя заданні, якія арыентаваны на разуменне, запамінанне і замацаванне новага вучэбнага матэрыялу, г. зн. арганізуецца праца па фарміраванні асновы дзеянняў для кожнага вучня;

4) кожны вучань у групе самастойна выконвае адно з прапанаваных заданняў;

5) усе выкананыя заданні ў групе тлумачацца ўслых кожным вучнем па чарзе (мэтазгодна пачынаць тлумачэнне з больш моцнага вучня), астатнія ўдзельнікі групы кантралююць тлумачэнне таго, хто выступае;

6) калі ў каго-небудзь з удзельнікаў групы ў выкананні задання ўзнікалі цяжкасці або былі дапушчаны памылкі, астатнія вучні дапамагаюць ім: спрабуюць высветліць прычыну дапушчанай памылкі, тлумачаць вывучаны матэрыял і патрабуюць паўторнага тлумачэння выконваемых дзеянняў;

7) кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы.

Разгледзім варыянт «Навучанне ў камандзе», які можна выкарыстоўваць на **этапе праверкі дамашняга задання па тэме *«Усё свой час мае. Янка Купала “Хлопчык і лётчык”; Эдзі Агняцвет “Хто пачынае дзень?”»*.**

Пасля вывучэння тэмы «Усё свой час мае» вучні атрымалі дамашняе заданне: падрыхтаваць выразнае чытанне вершаў Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык» і Эдзі Агняцвет «Хто пачынае дзень?». На наступным уроку настаўнік выконвае праверку дамашняга задання. Спачатку вучні працуюць у парах: чытаюць верш суседу па парце, а потым мяняюцца ролямі. Пасля чаго вучням прапануецца праца ў камандзе.

**Першы этап.**

***Настаўнік (Н.):*** Зараз будзем працаваць у групе. Для гэтага мы падзелімся на каманды.

**Другі этап.**

Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па 4 чалавекі. Пажадана, каб у адной групе былі хлопчыкі і дзяўчынкі, а таксама вучні з высокім і нізкім узроўнямі матывацыі.

***Н.:*** Мы падзелімся на групы па 4 чалавекі. Групуемся па 2 парты, якія стаяць адна за адной.

Калі пры дзяленні на групы па 4 чалавекі застаюцца 1, 2 або 3 вучня, то вучням з высокім узроўнем матывацыі можна даць асобнае заданне, якое яны будуць выконваць у сваёй міні-камандзе. Або прызначыць памочнікамі настаўніка, якія пры неабходнасці будуць дапамагаць асобным групам.

**Трэці этап.**

Настаўнік прысвойвае кожнаму вучню групы нумары — 1, 2, 3, 4.

**Чацвёрты этап.**

Настаўнік размяркоўвае, хто з вучняў якое заданне будзе выконваць.

***Н.:*** Уважліва слухаем заданне:

– вучні пад нумарам 1 выразна чытаюць першы слупок верша Эдзі Агняцвет «Хто пачынае дзень?» [4, с. 7–8] і адказваюць на пытанне: чым займаецца шафёр?;

– вучні пад нумарам 2 выразна чытаюць другі слупок верша і адказваюць на пытанне: чым займаецца хлебапёк?;

– вучні пад нумарам 3 выразна чытаюць трэці слупок верша і адказваюць на пытанне: чым займаецца маляр?;

– вучні пад нумарам 4 выразна чытаюць чацвёрты слупок і адказваюць на пытанне: хто пачынае дзень?;

– вучні, якія не трапілі ў каманду, рыхтуюць вуснае паведамленне (2–3 сказы) пра прафесіі сваіх бацькоў.

***Н.:*** Нагадваю, што адказы на пытанні павінны быць поўнымі. На выкананне задання ў вас 1–2 хвіліны.

**Пяты і шосты этапы.**

Кожны ўдзельнік групы па чарзе спачатку паўтарае сваё заданне, потым дае адказ, а астатнія вучні кантралююць адказ вучня, які выступае. Праца ў групе (паўтарэнне задання, адказ) адбываецца наступным чынам: 1 → 2 → 3 → 4 → 1.

Калі вучань, які адказвае, адчувае цяжкасці альбо дапускае памылкі, удзельнікі групы дапамагаюць яму.

***Н.:*** Час на выкананне задання скончыўся. Прыступаем да адказаў у групе. Кожная група працуе самастойна. Я даю вам 1–2 хвіліны.

Групы працуюць.

***В. 1:*** Мне трэба было выразна прачытаць першы слупок верша і адказаць на пытанне: чым займаецца шафёр? (Выразна чытае слупок верша і адказвае на пытанне.)

Раней за ўсіх устаў шафёр,
Пабег да гаража.
Не любіць соннай цішыні,
Гарачая душа! [4, с. 7]

— Шафёр возіць розныя *вешчы*.

***В. 3:*** У беларуская мове няма слова *вешчы*.

***В. 1:*** Я забыў, як гэта будзе па-беларуску.

***В. 3:*** Рэчы.

***В. 1:*** Дзякуй! Шафёр возіць розныя рэчы.

***В. 2:*** Мне трэба было выразна прачытаць другі слупок верша і адказаць на пытанне: чым займаецца хлебапёк? (Выразна чытае слупок верша і адказвае на пытанне.)

Устане рана хлебапёк,
Адчуе смачны пах,
І пойдзе жытні свежы хлеб
З румянцам на [ще]ках [4, с. 8].

— Хлебапёк пячэ хлеб.

***В. 1:*** Ты няправільна прачытала апошняе слова. У цябе атрымалася [ще]*ках*. Прачытай яшчэ раз гэта слова па літарах.

***В. 2:*** Шча-ках. Дзякуй!

***В. 3:*** Мне трэба было выразна прачытаць трэці слупок верша і адказаць на пытанне: чым займаецца маляр? (Выразна чытае слупок верша і адказвае на пытанне.)

Па-свойму радуе маляр
Прыроду і людзей:
Прыносіць колеры вясны
Вясёлы чарадзей! [4, с. 8]

— Маляр фарбуе сцены дамоў.

***В. 2:*** Маладзец! Усё добра.

***В. 4:*** Мне трэба было выразна прачытаць чацвёрты слупок верша і адказаць на пытанне: хто пачынае дзень? (Выразна чытае слупок верша і адказвае на пытанне.)

Спытайся ў сонца і зямлі,
Спытайся ў чыстых рэк:
— Хто пачынае новы дзень?
— Рабочы чалавек [4, с. 8].

— Дзень пачынае чалавек, які працуе.

***В. 1:*** Ты невыразна прачытала радок з пытальнікам. Прачытай яго больш выразна.

***В. 4:*** Хто пачынае новы дзень?

***В. 1:*** Цяпер добра.

**Сёмы этап.**

Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы. Для эканоміі часу гэты этап можна правесці франтальна.

***Н.:*** Час скончыўся, і цяпер кожная група прадставіць нам свае адказы. Аднак я ўпэўнена, што вы ўсе добра папрацавалі, і для таго, каб паспець паказаць нам вынікі сваёй працы, я прапаную кожнай групе выбраць аднаго лепшага прадстаўніка, які раскажа нам сваё заданне.

Групы выбіраюць сваіх прадстаўнікоў і прэзентуюць выкананае заданне.

Выкарыстанне навучання ў камандзе на этапе праверкі дамашняга задання дапамагае настаўніку праверыць гатоўнасць дамашняга задання ў кожнага вучня пры невялікіх затратах часу, выключае наяўнасць стрэсавай сітуацыі пры адказе, дае магчымасць размаўляць па-беларуску кожнаму вучню і стварае ўмовы для развіцця камунікатыўных уменняў у дзяцей.

Цяпер прапануем прыклад выкарыстання дадзенай тэхналогіі на **абагульняльным уроку па раздзеле «*Клопат пра тых, хто навокал*»**. У канцы гэтага раздзела ў вучэбным дапаможніку [4, с. 54–56] прыведзены адпаведныя заданні для абагульнення ведаў і абмеркавання прачытанага. Разгледзім варыянт выкарыстання «Навучанне ў камандзе» пры выкананні такога роду заданняў.

Так, у заданні пад нумарам 4 вучням прапануецца зрабіць наступнае:

«Прачытайце спалучэнні слоў. З якіх яны твораў? Назавіце аўтараў. Якія з гэтых твораў вас найбольш уразілі? Чым?

1) Суровая зіма → высокія гурбы → бярозавыя венікі = ...

2) Прыгожы парк → векавыя ліпы → шпачыная сям'я = ...

3) Чырвоныя кропелькі → маміны пацеркі → божыя кароўкі = ...

4) Тралейбусны прыпынак → белы пуховы камяк → ружовы язычок = ...».

**Першы этап.** Настаўнік прапануе вучням адгарнуць вучэбны дапаможнік на адпаведнай старонцы і знайсці заданне пад нумарам 4.

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па 4 чалавекі.

**Трэці этап.** Настаўнік прысвойвае вучням групы нумары 1, 2, 3, 4.

**Чацвёрты этап.** Настаўнік размяркоўвае, хто з вучняў якое заданне будзе выконваць.

***Н.:*** Цяпер слухаем заданне. Вам трэба адказаць, з якога твора спалучэнні слоў, і назваць яго аўтара, а таксама пераказаць невялікі ўрывак з гэтага твора, які найбольш вас уразіў:

– вучні пад нумарам 1 — чытаюць спалучэнні слоў пад лічбай 1;

– вучні пад нумарам 2 — чытаюць спалучэнні слоў пад лічбай 2;

– вучні пад нумарам 3 — чытаюць спалучэнні слоў пад лічбай 3;

– вучні пад нумарам 4 — чытаюць спалучэнні слоў пад лічбай 4.

***Н.:*** На выкананне задання ў вас 5 хвілін.

Вучні самастойна выконваюць заданні.

**Пяты этап.** Кожны ўдзельнік групы па чарзе спачатку паўтарае сваё заданне, потым дае свой адказ, а астатнія вучні кантралююць адказ вучня, які выступае. Праца ў групе: паўтарэнне заданні, адказ, адбываецца наступным чынам: 1 → 2 → 3 → → 4 → 1.

**Шосты этап.** Праца над дапушчанымі памылкамі.

**Сёмы этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы. Групы выступаюць па чарзе, якая вызначаецца шляхам жараб'ёўкі.

Вучняў неабходна загадзя рыхтаваць да таго, што калі адна група выступае, то ўсе астатнія ўважліва слухаюць адказ. Калі ў працэсе выступлення каманды клас заўважыў нейкія памылкі або недакладнасці, то іх можна выправіць пасля выступлення групы.

Выкарыстанне навучання ў камандзе на абагульняльных уроках дапамагае настаўніку зрабіць працэс абагульнення ведаў больш эфектыўным, творча арганізаваць вучэбную дзейнасць і стварыць умовы для развіцця маўленчай дзейнасці кожнага вучня.

Разгледзім яшчэ адзін варыянт «Навучанне ў камандзе», які можна выкарыстоўваць на ўроку **пазакласнага чытання па тэме *«Мы ў адказе за тых, каго прыручылі»*.** На папярэднім уроку пазакласнага чытання дзеці атрымалі заданне знайсці і прачытаць творы ў адпаведнасці са спіскам:

Я. Брыль «Жыў-быў вожык»;

А. Бутэвіч «Цікаўная котка»;

П. Кавалёў «Жыві сабе, зайчык»;

Я. Пархута «Снегавічок»;

Ю. Свірка «Ласіны стажок», «Сняжок»;

А. Ставер «Матылёк»;

П. Ткачоў «Шэрая курачка», «Ласяня»;

М. Янчанка «Бярозка».

**Першы этап.** Настаўнік арганізоўвае выставу кніг, якія трэба было прачытаць. Ён знаёміць дзяцей з кнігамі, расказвае дзецям пра аўтараў, паказвае вокладкі і ілюстрацыі. Затым настаўнік дэманструе карцінкі (вожыка, зайчыка, ласяняці, снегавіка, кошкі), а дзеці адгадваюць, з якіх твораў персанажы. Пасля гэтага вучням прапануецца папрацаваць у камандзе.

**Другі этап.** Настаўнік размяркоўвае вучняў на групы па 4 чалавекі.

**Трэці этап.** Настаўнік прысвойвае вучням групы нумары 1, 2, 3, 4.

У настаўніка падрыхтаваны канверты, на якіх напісаны лічбы 1, 2, 3, 4. Колькасць канвертаў павінна адпавядаць колькасці дзяцей у класе, а колькасць канвертаў з аднолькавым нумарам — колькасці груп. У кожным канверце ляжыць аркуш з чатырма невялікімі заданнямі для аднаго вучня.




Сутнасць заданняў — гэта падрыхтоўка кожным вучнем вуснага паведамлення пра адзін з твораў, які яны чыталі дома. Але паколькі вучні II класа павінны яшчэ навучыцца рыхтаваць свой вусны адказ, то ў канверце знаходзіцца своеасаблівы план падрыхтоўкі вуснага паведамлення, які па сутнасці складаецца з чатырох задач:

– здагадацца, пра які твор ідзе гаворка, і назваць яго;

– назваць аўтара гэтага твора;

– падрыхтаваць невялікі расказ пра твор;

– прачытаць маленькі ўрывак з яго.

Ніжэй прыведзены прыклады заданняў. (У дужках пазначаны правільныя адказы для настаўнікаў.)

***Заданне ў канверце пад нумарам 1:***

1) Выправіце назву твора: «Цікаўная мушка». *(«Цікаўная котка».)*

2) Назавіце аўтара твора. *(А. Бутэвіч.)*

3) Падрыхтуйце 2–3 сказы пра гэты твор.

4) Прачытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.

***Заданне ў канверце пад нумарам 2:***

1) Выправіце назву твора: «Жыві сабе, пеўнік!». *(«Жыві сабе, зайчык!».)*

2) Назавіце аўтара твора. *(П. Кавалёў.)*

3) Падрыхтуйце 2–3 сказы пра гэты твор.

4) Прачытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.

***Заданне ў канверце пад нумарам 3:***

1) Выправіце назву твора: «Ласіны ражок». *(«Ласіны стажок».)*

2) Назавіце аўтара твора. *(Ю. Свірка.)*

3) Падрыхтуйце 2–3 сказы пра гэты твор.

4) Прачытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.

***Заданне ў канверце пад нумарам 4:***

1) Выправіце назву твора: «Шэрая козачка». *(«Шэрая курачка».)*

2) Назавіце аўтара твора. *(П. Ткачоў.)*

3) Падрыхтуйце 2–3 сказы пра гэты твор.

4) Прачытайце цікавы маленькі ўрывак з яго.

Настаўнік размяркоўвае канверты па камандах (для адной каманды па адным канверце кожнага нумара):

– канверт пад нумарам 1 для вучняў пад нумарам 1;

– канверт пад нумарам 2 для вучняў пад нумарам 2;

– канверт пад нумарам 3 для вучняў пад нумарам 3;

– канверт пад нумарам 4 для вучняў пад нумарам 4.

Пры размеркаванні канвертаў неабходна ўлічваць, каму які канверт даць, таму што настаўнік заўсёды ведае пра сваіх вучняў крыху больш, чым яны самі. Неабходна зрабіць так, каб кожны вучань змог справіцца з прапанаваным заданнем, тым самым для кожнага вучня стварыць сітуацыю поспеху.

**Чацвёрты этап.** Вучні самастойна выконваюць заданні. На яго выкананне адводзіцца пэўны час.

**Пяты і шосты этапы**. Кожны ўдзельнік групы па чарзе спачатку паўтарае сваё заданне, а потым дае адказ, а астатнія вучні яго кантралююць. Калі вучань адчувае цяжкасці ў выкананні задання, удзельнікі групы дапамагаюць яму.

**Сёмы этап.** Кожная група прадстаўляе вынікі сваёй працы. Удзельнікі прадстаўляюць спачатку сваё заданне, а потым адказ на яго. Усе астатнія ўважліва слухаюць і не перабіваюць.

***Выступленне 1-й групы.***

***В. 1:*** Мне трэба было выправіць назву твора, назваць аўтара твора, падрыхтаваць 2–3 сказы пра твор і прачытаць урывак з яго.

Твор называецца «Цікаўная котка». Яго аўтар — Анатоль Бутэвіч. У творы расказваецца пра котку Рыску і яе гаспадыню Надзейку. Котка была вельмі цікаўная і заўсёды што-небудзь тварыла.

Чытае ўрывак: «...Бывала, залезе на стол, абнюхае ўвесь посуд і незнарок сапхне кубачак. А сама схаваецца пад каналу ці то ад шуму, ці то ад страху, каб не пакаралі» [5].

Астатнія вучні прадстаўляюць вынікі працы аналагічна.

Пасля выступлення ўсіх груп можна з класам выбраць групу, якая лепш за ўсіх падрыхтавалася, ці групу, у адказах якой было менш за ўсіх моўных памылак, альбо групу, у якой быў найбольш поўны адказ.

Выкарыстанне навучання ў камандзе на ўроках пазакласнага чытання дазваляе настаўніку праверыць гатоўнасць да ўрока кожнага вучня, даць магчымасць творча сябе праявіць. Акрамя таго, ствараецца сітуацыя поспеху для кожнага вучня і ў дзяцей з'яўляецца матывацыя да чытання кніг.

У прапанаваным артыкуле мы разгледзелі магчымасці выкарыстання тэхналогіі навучання ў супрацоўніцтве на некалькіх уроках літаратурнага чытання ў II класе. Выкарыстанне навучання ў камандзе дапамагае настаўніку зрабіць працэс абагульнення ведаў больш эфектыўным і стварыць умовы для развіцця маўленчай дзейнасці кожнага вучня. Акрамя таго, праца па дадзенай тэхналогіі развівае навыкі зносін і камунікацыі, што ў выніку спрыяе фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 2 класс / Министерство образования Республики Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2017. — 195 с.
2. *Шилова, Е. С.* Реализация технологии обучения в сотрудничестве при изучении нового материала на уроках математики в III классе / Е. С. Шилова // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2020. — № 4. — С. 26–29.
3. *Мурашка, Н. У.* Тэхналогія навучання ў супрацоўніцтве як сродак фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў: урокі беларускай мовы ў I класе / Н. У. Мурашка, А. С. Шылова // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. — 2020. — № 8. — С. 25–29.
4. *Антонава, Н. У.* Літаратурнае чытанне : вучэб. дапаможнік для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. — Ч. 2. — 135 с.
5. *Бутэвіч, А.* Цікаўная котка [Электронны рэсурс] / Karotkizmest.by Беларуская літаратура // А. Бутэвіч. — Рэжым доступу: https://karotkizmest.by. — Дата доступу: 07.03.2020.